Надвор'е

Добрага дажджу пакуль не будзе

А ў выхадныя — начныя замаразкі

Пачатак чэрвеня не прынясе раслінам патрэбнай вільгаці, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу неба воблачнае з праясненнямі. Днём месцамі, а па паўднёвым усходзе краіны на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень па паўднёвым усходзе ў асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Вецер уначы пераменных кірункаў 3—8 м/с. Удзень вецер паўночны 5—10 м/с, парывы ўзмоцняцца да 14 м/с, а месцамі дасягнуць 15—18 м/с. Максімальная тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 10 градусаў на поўначы да плюс 26 градусаў на паўднёвым усходзе. Атмасферны ціск ноччу будзе слаба падаць, днём расці.

На гэтым з ападкамі ўсё. Затое прыйдзе час чэрвеньскіх замаразкаў. Спецыялісты лічаць, што 3 і 4 чэрвеня надвор'е будзе вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, толькі днём па поўначы краіны адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы.

У суботу пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, днём месцамі па поўначы краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Вецер паўночна-заходні, паўночны ўмераны. Тэмпература паветра мінімальная ноччу 1—7 цяпла, месцамі чакаюцца замаразкі ад нуля да мінус 2 градусаў. Максімальная тэмпература паветра днём складзе ад плюс 13 градусаў да 20 цяпла.

І ў нядзелю сітуацыя падобная, толькі днём стане крыху цяплей. Пераважна без ападкаў, месцамі на поўначы краіны чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Вецер няўстойлівы слабы да ўмеранага. Мінімальная тэмпература паветра ноччу — 1—6 цяпла, месцамі чакаюцца замаразкі да 2 марозу. Максімальная тэмпература паветра днём будзе ад плюс 16 градусаў да 23 цяпла.

Увага! У сувязі з доўгім перыядам сухога надвор'я ў лясах краіны ўсталявалася высокая пажарная небяспека, а ў многіх раёнах Гомельскай вобласці і месцамі па Мінскай, Брэсцкай абласцях — надзвычайная пажарная небяспека. Будзьце асцярожныя з агнём!

Акрамя таго, менавіта на выхадныя айчынныя спецыялісты падрыхтавалі штармавое гідралагічнае апавяшчэнне. На Заходняй Дзвіне ў Віцебску ўзровень вады апусціўся ніжэй за адзнаку, пры якой узнікаюць цяжкасці ў рабоце рачнога транспарту.

На пачатак месяца падрыхтаваны гідралагічны бюлетэнь. У мінулы перыяд (26—30 мая) на Заходняй Дзвіне каля Віцебска і на Дняпры каля Жлобіна пагоршыліся ўмовы для суднаходства. Па стане на 31 мая на рэках адзначаўся ў асноўным спад узроўняў вады з сутачнай інтэнсіўнасцю 1—25 сантыметраў.

На Заходняй Дзвіне каля Віцебска, Нёмане каля Гродна, Дняпры каля Магілёва і Жлобіна, Сожы каля Крычава і Слаўгарада ўзроўні вады знаходзяцца ніжэй адзнак, якімі лімітуюць суднаходства.

Тэмпература вады ў рэках і вадаёмах знаходзіцца ў межах ад 12 да 20 цяпла.

Спецыялісты адзначаюць, што ў найбліжэйшую пяцідзённу на рэках будзе назірацца спад узроўняў вады, у выніку чаго на Прыпяці каля Мазыра вада ўвойдзе ў рэчышча. На Дняпры каля Рэчыцы ўзровень вады апусціцца ніжэй ад небяспечна нізкай адзнакі, пры якой узнікаюць цяжкасці ў рабоце рачнога транспарту.

Сяргей КУРКАЧ.

Даты Падзеі Людзі

2 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1942 год — нарадзіўся Эдуард Васілевіч Малафееў, беларускі і савецкі спартсмен і трэнер (футбол), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі і СССР. У 1963—1972 гадах гуляў нападаючым у складзе мінскага «Дынама». З 1963 года ў складзе зборнай каманды СССР адыграў 40 матчаў, забіў шэсць мячоў. З 2000 да 2003 года Э. Малафееў узначальваў зборную Беларусі па футболе. Менавіта пры ім зборная дасягнула найлепшага выніку на сённяшні момант: у адборачным цыкле чэмпіянату свету-2002 беларусы ледзь не выйшлі ў стыкавыя матчы, заняўшы трэцяе месца ў групе.

1943 год — нарадзіўся Юрый Іванавіч Івашчанка, беларускі архітэктар. Сярод работ — жылыя дамы ў Мінску па вуліцах Я. Коласа, А. Макаёнка, А. Бурдзейнага. Удзельнічаў у стварэнні Рэспубліканскага каталога індустрыяльных вырабаў і распрацоўцы асобных серый буйнапанэльных жылых дамоў і блок-секцый для Гомеля, Брэста, Гродна і іншых гарадоў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1842 год — выйшаў з друку першы том паэмы Мікалая Гогаля «Мёртвыя душы».

1844 год — нарадзіўся Васіль Дзмітрыевіч Паленаў, рускі мастак-перасоўнік, сапраўдны член Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Аўтар пейзажаў, карцін на бытавыя і гістарычныя тэмы.

1876 год — нарадзіўся Канстанцін Андрэевіч Транёў, савецкі пісьменнік, драматург. Аўтар апавяданняў пра дарэвалюцыйную вёску («Шэсць тыдняў», «На кірмашы», «Наймітыі»), народнай трагедыі «Пугачоўшчына», а таксама гераічнай драмы пра Грамадзянскую вайну «Любоў Яравая», пастаўленай упершыню на сцэне Малога тэатра ў Маскве 22 снежня 1926 года. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

1955 год — дырэктывай Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР на тэрыторыі Казахстана быў сфарміраваны 5-ы Навукова-даследчы выпрабавальны палігон Міністэрства абароны СССР.

Так гаварыў...

ЛЮК ВАВЕНАРГ:

«Парады старых людзей — як зімовае сонца: свецяць, але не грэюць».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.44	21.32	16.48
Віцебск —	4.26	21.29	17.03
Магілёў —	4.34	21.22	16.48
Гомель —	4.39	21.10	16.31
Гродна —	5.01	21.45	16.44
Брэст —	5.10	21.37	16.27

Месяц

Першая квадра 27 мая. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Аляксея, Цімафея.*
К. *Марыяны, Пятра, Эразма.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

У дзіцячым садку пяцігадовыя дзеці абмяркоўваюць бацькоў:

— Яны самі не ведаюць, чаго хочуць! Спачатку вучаць нас хадзіць і размаўляць, а потым патрабуюць, каб мы сядзелі і маўчалі.

Мы з сябрамі-рыбакамі даўно ўжо прыкмецілі той факт, што дызайн новых блешань не асабліва ўлічвае меркаванне рыб. Усё робіцца дзеля таго, каб сам рыбак клюнуў і купіў такую.

Не за гарамі той дзень, калі нам давядзецца глядзець рэкламу перш, чым мы зможам адказаць на тэлефонны званок.

На працу хаджу хутка, каб не перадумаць.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 10.399. Індэкс 63850. Зак. № 1377. Нумар падпісаны ў 19.30 1 чэрвеня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12